Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
_________________ Ю. П. Бондар
«_____» ____________ 2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД - ___/вуч.

# ТЭХНАЛОГІІ КУЛЬТУРНА-ДАСУГАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (па напрамах), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01*
*Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент),*
*спецыялізацыі 1-23 01 11-01 03 Культурна-дасугавая дзейнасць бібліятэк*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

**Складальнік**

*Ю. А. Параверзева*, старшы выкладчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**Рэцэнзенты:**

*А. Л. Белая*, намеснік дырэктара навукова-педагагічнай бібліятэкі ўстановы «Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь»;

*С. Б. Майсяйчук*, прафесар кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 24.10.2011 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 29.11.2011 г.)

Адказны за выпуск *Ю. А. Параверзева*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Бібліятэкі як сацыяльныя інстытуты рэалізуюць функцыі культуры сродкамі характэрных ім спецыфічных форм, метадаў і магчымасцей, вызначаных іх тыпалагічнымі асаблівасцямі. Разам з тым незалежна ад тыпу бібліятэкі ажыццяўленне культурна-дасугавай дзейнасці спрыяе творчаму развіццю асобы карыстальніка; прыцягненню людзей да культурнай спадчыны і фарміраванню ў іх здольнасцей успрымаць мастацтва, навуковыя дасягненні, навацыі; усталяванню дыялога паміж культурамі і прапагандзе культурнай самабытнасці.

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны «Тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк» абумоўлена неабходнасцю фарміравання светапогляду, развіцця адукацыйна-выхаваўчай, ідэалагічнай, маральнай і эстэтычнай культуры, умацавання здароўя карыстальнікаў бібліятэк і ў гэтай сувязі – патрэбай набыцця студэнтамі прафесійных кампетэнцый у сферы арганізацыі культурна-дасугавай прасторы бібліятэк.

Праграма дысцыпліны пабудавана з улікам сучасных патрабаванняў да падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы. Яна структуравана па тэмах, якія з'яўляюцца адносна самастойнымі дыдактычнымі адзінкамі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца на набытыя студэнтамі веды па дысцыплінах «Культуралогія», «Гісторыя мастацтваў», «Педагогіка і псіхалогія», «Бібліятэказнаўства», «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк», «Тэорыя і гісторыя культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк» і інш.

*Мэтамі* выкладання дысцыпліны з'яўляюцца вывучэнне тэарэтычных асноў і канцэпцый арганізацыі культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках і авалоданне тэхналагічнымі і метадычнымі прыёмамі рэалізацыі бібліятэчных культурна-дасугавых праграм.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае кола *задач*:

– фарміраванне ў студэнтаў устойлівых ведаў па асновах тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк;

– засваенне тэрміналагічнай сістэмы і спасціжэнне спецыфікі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк розных тыпаў у арганізацыйна-метадычным аспекце;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выпрацоўка ў студэнтаў уменняў і навыкаў пастаноўкі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках, рэалізацыі патэнцыялу дасуга карыстальнікаў;

– выпрацоўка ў студэнтаў уменняў і навыкаў кіравання культурна-дасугавай дзейнасцю ў бібліятэках.

Для набыцця прафесійных кампетэнцый у выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– мэты, задачы, функцыі і прынцыпы рэалізацыі тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк;

– падсістэмы тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці бібліятэк і іх асноўныя рысы;

– асноўныя этапы тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк;

– сутнасць тэхналагічнага працэсу культурна-дасугавай дзейнасці;

– формы, метады і выразныя сродкі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк;

– арганізацыйна-тэхналагічныя асаблівасці масавай работы з карыстальнікамі;

– арганізацыйна-тэхналагічную характарыстыку групавых і індывідуальных форм культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк;

– склад матэрыяльна-тэхнічнай базы культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк і яе фінансавае забеспячэнне;

– метадычнае забеспячэнне тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк.

Студэнт павінен *умець:*

– аналізаваць культурна-дасугавае асяроддзе бібліятэкі па такіх аспектах, як кампазіцыя, уласцівасці, якасць;

– вылучаць уласцівасці і адметныя рысы тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк розных тыпаў;

– выкарыстоўваць сацыяльна-псіхалагічны і тэрапеўтычны патэнцыял культурна-дасугавых праграм бібліятэк;

– распрацоўваць праграму тэхналагічнага працэсу культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэцы, ажыццяўляць яе аналіз, дыягностыку і рэфлексію;

– класіфікаваць масавыя, індывідуальныя і групавыя формы культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк;

– складаць сцэнарныя планы і сцэнарыі разнастайных формаў культурна-дасугавых праграм у бібліятэках;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ажыццяўляць планаванне, кантроль, улік, справаздачнасць па выніках рэалізацыі культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках;

– выкарыстоўваць маркетынгавыя даследаванні з мэтай пашырэння зместу культурна-дасугавых праграм бібліятэк і асартыменту культурных прадуктаў і паслуг.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць эфектыўнаму засваенню ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння вучэбных і даследчых задач, вылучаюцца: праблемнае навучанне, вучэбнае даследаванне, праектныя, камунікатыўныя і гульнявыя тэхналогіі, метады аналізу канкрэтных сітуацый.

Самастойная работа па курсе мае кіруемы і кантралюемы характар. Яна накіравана на выкананне студэнтамі ўласных распрацовак культурна-дасугавых праграм для бібліятэк розных тыпаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк» адведзены 172 гадзіны, з якіх 96 – аўдыторныя заняткі (32 гадзіны – лекцыі, 52 гадзіны – семінарскія заняткі, 12 гадзін – практычныя заняткі).

Рэкамендуемыя выніковыя формы кантролю ведаў – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем. | практ. |
| Уводзіны | 1 | 1 | | |
| ***Раздзел I. Асновы тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк*** | | | | |
| Тэма 1. Тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: паняцце і сутнасць | 4 | 2 | | 2 |
| Тэма 2. Сацыяльна-педагагічныя асновы тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк | 2 | 2 | | |
| ***Раздзел II. Арганізацыя і методыка культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк*** | | | | |
| Тэма 3. Улік асаблівасцей сацыякультурнага асяроддзя ў распрацоўцы культурна-дасугавых праграм бібліятэк | 2 | 2 | | |
| Тэма 4. Тэхналагічны працэс – аснова культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк | 8 | 2 | 4 | 2 |
| Тэма 5. Структура і этапы тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк | 4 | 2 | 2 | |
| Тэма 6. Арганізацыйна-тэхналагічныя пытанні масавай работы з карыстальнікамі | 10 | 2 | 6 | 2 |
| Тэма 7. Арганізацыйна-тэхналагічная характарыстыка групавых і індывідуальных форм культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках | 8 | 2 | 6 | |
| Тэма 8. Функцыянаванне тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: псіхалагічны аспект | 2 | 2 | | |
| ***Раздзел III. Пастаноўка культурна-дасугавых праграм бібліятэк*** | | | | |
| Тэма 9. Агульныя пытанні арганізацыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках | 4 | 2 | 2 | |
| Тэма 10. Драматургія культурна-дасугавых праграм бібліятэк | 12 | 2 | 8 | 2 |
| Тэма 11. Рэжысёрскія асновы арганізацыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках | 12 | 2 | 8 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ***Раздзел IV. Кіраванне культурна-дасугавай дзейнасцю ў бібліятэках*** | | | | |
| Тэма 12. Агульныя пытанні кіравання культурна-дасугавай дзейнасцю ў бібліятэках | 6 | 2 | 2 | 2 |
| Тэма 13. Кіраванне тэхналагічным працэсам распрацоўкі і рэалізацыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках | 6 | 2 | 4 | |
| Тэма 14. Маркетынг культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк | 5 | 1 | 4 | |
| Тэма 15. Эфектыўнасць дзейнасці бібліятэк па забеспячэнні вольнага часу карыстальнікаў | 4 | 2 | 2 | |
| Тэма 16. Метадычнае забеспячэнне тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк | 6 | 2 | 4 | |
| **Разам ...** | **96** | **32** | **52** | **12** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Прадмет, змест і задачы дысцыпліны «Тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк», яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў. Веды і кампетэнцыі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння дысцыпліны. Асноўныя віды заняткаў, арганізацыя самастойнай работы. Формы кантролю. Забяспечанасць дысцыпліны вучэбна-метадычнай літаратурай.

Мэты, задачы і функцыі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк у тэхналагічным аспекце. Асноўныя кірункі рэалізацыі культурна-дасугавага патэнцыялу бібліятэк. Спецыфіка культурна-дасугавай дзейнасці публічных і дзіцячых бібліятэк. Культурна-дасугавыя цэнтры пры бібліятэках: агульная характарыстыка.

Культурна-дасугавае асяроддзе бібліятэкі: кампазіцыя, задачы, уласцівасці, якасць.

## Р а з д з е л I
## АСНОВЫ ТЭХНАЛОГІЙ КУЛЬТУРНА-ДАСУГАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

### Тэма 1. Тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: паняцце і сутнасць

Тэарэтычнае і прыкладное значэнне паняцця «тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк». Гісторыя развіцця тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Навуковыя даследаванні Г. К. Алзоевай, А. Д. Жаркова, А. У. Дамарэнка, С. Б. Майсяйчук, І. Л. Смарговіч, Л. А. Дзямешка, М. У. Сокал у галіне тэорыі і практыкі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Характарыстыка сучасных канцэпцый тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: тэорыі дзейнасці, культурна-асветніцкай, педагагічнай і гаспадарчай канцэпцый. Аб’екты і суб’екты тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Віды і асноўныя рысы тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Прынцыпы рэалізацыі тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Ас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ноўныя падсістэмы тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: арганізацыйная, метадычная, псіхалагічная.

### Тэма 2. Сацыяльна-педагагічныя асновы тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк

Сацыяльна-педагагічныя ўмовы функцыянавання тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Уплыў знешніх (аб'ектыўных) і ўнутраных (суб'ектыўных) фактараў на паводзіны карыстальнікаў ва ўмовах культурнага ўздзеяння. Характарыстыка аб'ектыўных сацыяльных умоў ажыццяўлення тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Педагагічны патэнцыял публічнай работы бібліятэк.

Суб'ектыўныя фактары: сутнасць, структура, уздзеянне на тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк.

Камунікатыўная спецыфіка тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэчных устаноў. Бібліятэчныя зносіны як аснова развіцця відаў і форм культурна-дасугавай дзейнасці. Прафесійна-педагагічныя зносіны ў структуры масавай, групавой і індывідуальнай работы з карыстальнікамі бібліятэк. Апасродкаваныя і неапасродкаваныя зносіны ў межах культурна-дасугавых бібліятэчных праграм.

Сацыяльна-псіхалагічныя і тэрапеўтычныя асаблівасці зносін у кантэксце бібліятэчнай культурна-дасугавай работы. Метады рэгулявання камунікатыўнага працэсу культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк.

Спецыялізацыя бібліятэк па арганізацыі вольнага часу карыстальнікаў.

## Р а з д з е л  II
## АРГАНІЗАЦЫЯ І МЕТОДЫКА КУЛЬТУРНА-ДАСУГАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

### Тэма 3. Улік асаблівасцей сацыякультурнага асяроддзя ў распрацоўцы культурна-дасугавых праграм бібліятэк

Спецыфічныя характарыстыкі сацыяльна-культурнага асяроддзя і іх уплыў на развіццё культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Сутнасць і прыярытэты дзяржаўнай культурнай палітыкі ў сферы культурна-дасугавай дзейнасці. Гісторыка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурныя, дэмаграфічныя, геаграфічныя, каштоўнасныя арыенціры тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк.

Арганізацыя культурна-дасугавай дзейнасці на макра- і мікраўзроўнях бібліятэчнай работы. Характарыстыка знешніх фактараў, якія ўплываюць на змест і структуру культурна-дасугавых праграм бібліятэк. Асноўныя ўнутраныя фактары развіцця культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках, іх кампанентная структура і сацыяльна-псіхалагічная сутнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Тэхналагічны працэс – аснова культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк

Паняцце тэхналагічнага працэсу з матэрыяльна-тэхнічнага, нарматыўнага і псіхолага-педагагічнага пунктаў гледжання. Мікра- і макраасяроддзе як перадумова развіцця тэхналагічнага працэсу культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках. Структура тэхналагічнага працэсу: сацыяльны заказ, мэта, змест, формы, метады, сродкі дасягнення мэты, матэрыяльна-тэхнічнае і кадравае забеспячэнне, фінансаванне. Культурна-дасугавая праграма як вынік тэхналагічнага працэсу.

Характарыстыка выразных сродкаў тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці: жывое слова, віды мастацтваў, сімволіка-алегарычныя і тэхнічныя сродкі, нагляднасць, эстэтычна арганізаванае асяроддзе.

Формы культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Тыпалогія формаў з улікам ахопу карыстальнікаў, паводле спосабаў уздзеяння, у залежнасці ад відаў дзейнасці.

Метады культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: паняцце, тыпалогія. Сутнасць метадаў тэатралізацыі, ілюстравання, гульні.

## Тэма 5. Структура і этапы тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк

Структурна-тыпалагічная характарыстыка тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Знешнія і ўнутраныя сувязі ў межах тэхналагічнага працэсу. Роля мастацкага тыпу творчасці ў фарміраванні тэхналагічнага рада культурна-дасугавых праграм бібліятэк. Характарыстыка структуры тэх-

налагічнага працэсу на лінейным узроўні: асноўныя аргструктуры і формы культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Кампаненты тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: змест, кампазіцыя, маштаб і характар аўдыторыі, сродкі рацыянальнага і эмацыянальнага ўздзеяння.

Асноўныя этапы тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: аналіз абставін і фармулёўка мэты; планаванне; распрацоўка алгарытму тэхналагічнага працэсу; падрыхтоўка і правядзенне культурна-дасугавай праграмы; аналіз, дыягностыка і рэфлексія.

## Тэма 6. Арганізацыйна-тэхналагічныя пытанні масавай работы з карыстальнікамі

Вызначэнне паняцця «масавая работа». Мэты і задачы масавай работы ў бібліятэцы; фактары, якія ўплываюць на яе арганізацыю. Бібліятэчныя праграмы (мерапрыемствы) – асноўныя формы масавай работы. Прынцыпы падрыхтоўкі масавых форм культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках. Класіфікацыя масавых форм культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Асноўныя прыкметы масавых форм работы з карыстальнікамі.

Методыка падрыхтоўкі традыцыйных, інавацыйных, вусных, наглядных і комплексных бібліятэчных мерапрыемстваў. Асаблівасці тэхналагічнага працэсу рэалізацыі актыўных, пазітыўных, крытыка-аналітычных, пазітыўна-ілюстрацыйных бібліятэчных праграм.

Этапы падрыхтоўкі і правядзення бібліятэчных праграм (мерапрыемстваў): прэдкамунікатыўны, камунікатыўны, посткамунікатыўны – агульная характарыстыка. Сродкі ўздзеяння на карыстальнікаў пры правядзенні бібліятэчных праграм (мерапрыемстваў).

## Тэма 7. Арганізацыйна-тэхналагічная характарыстыка групавых і індывідуальных форм культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках

Паняцце групавых і індывідуальных форм культурна-дасугавай дзейнасці у бібліятэцы. Мэты, задачы і асноўныя кірункі групавой і індывідуальнай работы з карыстальнікамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Формы, структура і жанравыя асаблівасці групавых культурна-дасугавых праграм бібліятэк. Напрамкі і ўмовы рэалізацыі групавых форм культурна-дасугавай дзейнасці ў публічных і дзіцячых бібліятэках.

Змест і ўмовы распрацоўкі індывідуальных форм культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках.

### Тэма 8. Функцыянаванне тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк: псіхалагічны аспект

Індывідуальны і сацыяльна-псіхалагічны падыходы да функцыянавання тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Узаемасувязь тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці і інтарэсаў бібліятэчнай аўдыторыі. Выхаваўчы ўплыў культурна-дасугавых праграм бібліятэк на асобу і грамадства. Улік сацыяльных умоў, маральных норм, традыцый, звычаяў, інтарэсаў, стэрэатыпаў паводзін і адносін карыстальнікаў пры рэалізацыі працэсаў тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці.

Характарыстыка груп сацыяльна-псіхалагічных механізмаў функцыянавання тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Успрыманне бібліятэчнай аўдыторыяй культурна-дасугавых мерапрыемстваў. Выбар форм і відаў прадметнай дзейнасці культурна-дасугавай накіраванасці. Улік псіхалагічных сітуацый пры пабудове тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк.

Паняцце сацыяльна-псіхалагічнага клімату і сацыяльна-псіхалагічнай атмасферы ў дачыненні аўдыторыі культурна-дасугавых праграм бібліятэк.

## Р а з д з е л III
## ПАСТАНОЎКА КУЛЬТУРНА-ДАСУГАВЫХ ПРАГРАМ БІБЛІЯТЭК

### Тэма 9. Агульныя пытанні арганізацыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках

Вызначэнне паняцця «культурна-дасугавая праграма». Формы культурна-дасугавых праграм бібліятэк, іх уздзеянне на змест і спосаб арганізацыі драматургічнага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя арганізацыйныя этапы падрыхтоўкі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках: удакладненне зоны абслугоўвання; вызначэнне кола патэнцыяльнай аўдыторыі і яе структуры; ранжыраванне катэгорый насельніцтва і карыстальнікаў па ўдзельнай вазе ў структуры патэнцыяльнай аўдыторыі наведвальнікаў; выяўленне ступені адрозненняў у структурах патэнцыяльнай і рэальнай аўдыторыі; карэкцыя структуры наведвальнікаў бібліятэчных праграм (мерапрыемстваў).

Значэнне бюджэту вольнага часу карыстальнікаў, дэмаграфічных характарыстык, умоў працы і адпачынку ў арганізацыі культурна-дасугавых праграм бібліятэк. Спецыфічныя формы культурна-дасугавых праграм бібліятэк.

Прынцыпы, задачы і метады планавання культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках. Віды планаў культурна-дасугавай дзейнасці, іх структура, сацыяльна-эканамічнае значэнне.

## Тэма 10. Драматургія культурна-дасугавых праграм бібліятэк

Драматургія культурна-дасугавых праграм як важнейшая частка тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэкі. Агульныя рысы драматургіі культурна-дасугавых праграм бібліятэк з іншымі відамі драматургічнага мастацтва. Колькасныя і якасныя паказчыкі драматургіі культурна-дасугавых праграм бібліятэк.

Сцэнарый – драматургічная аснова культурна-дасугавай праграмы бібліятэкі. Этымалогія і сучасная трактоўка паняцця «сцэнарый культурна-дасугавай праграмы». Асноўныя этапы работы над сцэнарыем культурна-дасугавай праграмы ў бібліятэцы: канструкцыя сцэнарнага плана, напісанне літаратурнага сцэнарыя, састаўленне мантажнага ліста. Архітэктоніка сцэнарыя культурна-дасугавай праграмы ў бібліятэцы. Кампазіцыйныя элементы сцэнарыя культурна-дасугавай праграмы бібліятэкі: экспазіцыя, завязка, асноўнае дзеянне, кульмінацыя, фінал.

Характарыстыка мантажнага метаду арганізацыі сцэнарнага матэрыялу культурна-дасугавай праграмы бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 11. Рэжысёрскія асновы арганізацыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках

Рэжысура як працэс сінтэзу сродкаў мастацка-эмацыянальнага ўздзеяння і драматургічнага матэрыялу. Прынцыпы рэжысуры культурна-дасугавых праграм у бібліятэках. Этапы ўвасаблення рэжысёрскай звышзадачы пры стварэнні культурна-дасугавай праграмы. Прыёмы, выкарыстанне якіх магчымае ў рэжысуры культурна-дасугавай праграмы ў бібліятэцы.

Выкарыстанне мастацка-вобразных і сімволіка-алегарычных сродкаў пры пастаноўцы бібліятэчных культурна-дасугавых праграм. Класіфікацыя мастацкіх метадаў культурна-дасугавай дзейнасці і іх выкарыстанне ў культурна-дасугавых праграмах бібліятэк. Выкарыстанне сімвалаў, метафар і алегорый у афармленні дэкарацый да культурна-дасугавай праграмы.

# Р а з д з е л IV
# КІРАВАННЕ КУЛЬТУРНА-ДАСУГАВАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ Ў БІБЛІЯТЭКАХ

## Тэма 12. Агульныя пытанні кіравання культурна-дасугавай дзейнасцю ў бібліятэках

Кіраванне культурна-дасугавай дзейнасцю ў бібліятэках: азначэнне, сутнасць. Узроўні кіравання культурна-дасугавай дзейнасцю бібліятэк. Аб’екты і суб’екты кіравання культурна-дасугавай дзейнасцю ў бібліятэцы. Дыферэнцыяцыя суб’ектаў кіравання ў залежнасці ад займаемай пасады: іх функцыі, абавязкі, правы і паўнамоцтвы. Прафесійная дзейнасць загадчыкаў аддзелаў і загадчыкаў сектараў па рэалізацыі функцыі кіравання культурна-дасугавай дзейнасцю. Сацыякультурныя цэнтры бібліятэк як спецыфічны аб’ект кіравання.

Асаблівасці кіравання культурна-дасугавай дзейнасцю ў бібліятэках розных тыпаў і відаў: аргструктура, прынцыпы і метады кіравання. Асноўныя функцыі кіравання культурна-дасугавай дзейнасцю: планаванне, арганізацыя, улік, кантроль, рэгуляванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя рысы гаспадарчага механізма ў сферы культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Матэрыяльна-тэхнічная база культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Фінансавае забеспячэнне тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках.

Структура і змест справаздачнай дакументацыі па выніках культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках.

## Тэма 13. Кіраванне тэхналагічным працэсам распрацоўкі і рэалізацыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках

Асноўныя тэхналагічныя працэсы і аперацыі, характэрныя для пастаноўкі культурна-дасугавых праграм бібліятэк, рэалізацыі культурных прадуктаў і паслуг; іх структурна-лагічная пабудова. Мадэль рэкрэацыйнай і дасугавай дзейнасці бібліятэк.

Нарміраванне працэсаў, звязаных з падрыхтоўкай масавых, групавых і індывідуальных бібліятэчных мерапрыемстваў. Віды нормаў. Метады нарміравання.

Наменклатура бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг культурна-дасугавага профілю; іх сацыяльна-эканамічная, тэхналагічная, адукацыйна-выхаваўчая характарыстыка.

Дакументы, рэгулюючыя тэхналогію распрацоўкі і рэалізацыі культурна-дасугавых мерапрыемстваў і праграм: нарматыўныя, тэхналагічныя, метадычныя.

Выкарыстанне аўтаматызаваных сродкаў бібліятэчнай вытворчасці ў рэалізацыі тэхналагічных працэсаў культурна-дасугавай дзейнасці. Падрыхтоўка тэхналагічных карт, блок-схем выкарыстання тэхнічнага абсталявання, праектнай дакументацыі, экскурсійных маршрутаў. Праблемы ўдасканалення кіравання тэхналагічным працэсам культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках.

## Тэма 14. Маркетынг культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк

Дзейнасць аддзелаў маркетынгу па PR і рэкламе культурна-дасугавых праграм бібліятэк. Узаемадзеянне з аддзеламі камплектавання, абслугоўвання, навукова-метадычным ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзелам. Задачы рэкламнай дзейнасці. Іміджавая рэклама, рэклама культурна-дасугавых рэсурсаў і паслуг.

Вывучэнне мэтавай аўдыторыі культурна-дасугавых праграм. Маніторынг знешняга і ўнутранага асяроддзя бібліятэкі ў мэтах стварэння аптымальнай колькасці мерапрыемстваў культурна-дасугавага характару.

Выкарыстанне вынікаў маркетынгавых даследаванняў для пашырэння зместу культурна-дасугавых праграм, асартыменту культурных прадуктаў і паслуг, іх адаптацыі да патрэбнасцей карыстальнікаў.

Цэнавая палітыка і варыянты цэнаўтварэння на бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і паслугі культурна-дасугавага профілю ў залежнасці ад аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў.

## Тэма 15. Эфектыўнасць дзейнасці бібліятэк па забеспячэнні вольнага часу карыстальнікаў

Паняцце эфектыўнасці культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Віды эфектыўнасці культурна-дасугавых праграм бібліятэк. Характарыстыка асноўных падыходаў да вызначэння параметраў эфектыўнасці культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Сістэма крытэрыяў і паказчыкаў эфектыўнасці культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках. Методыка вывучэння эфектыўнасці розных кірункаў культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Метады дыягностыкі атмасферы бібліятэчнага мерапрыемства. Паказчыкі добразычлівай сацыяльна-псіхалагічнай атмасферы аўдыторыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках. Якасць культурна-дасугавых прадуктаў і паслуг бібліятэк, сістэма кіравання ёю. Кірункі павышэння эфектыўнасці культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк.

## Тэма 16. Метадычнае забеспячэнне тэхналогій культурна-адпачынкавай дзейнасці бібліятэк

Паняцце метадычнай дапамогі ў культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк, яе змест і асаблівасці. Сутнаснае прызначэнне метадычнага забеспячэння ў галіне тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Функцыі метадычнай работы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дачыненні да культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Асноўныя кірункі метадычнага забеспячэння культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк. Методыка-кансультацыйная работа: асаблівасці ў бібліятэках розных тыпаў і відаў. Змест, характарыстыка і віды метадычных матэрыялаў. Павышэнне кваліфікацыі персаналу бібліятэкі, які арганізуе культурна-дасугавую дзейнасць. Сістэма дадатковай прафесійнай адукацыі ў сферы арганізацыі культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк, яе спецыфічныя адметнасці. Праблемы ўдасканалення падрыхтоўкі бібліятэчнага персаналу да ажыццяўлення культурна-дасугавай дзейнасці. Інфармацыйнае забеспячэнне культурна-дасугавай дзейнасці ў бібліятэках. Выкарыстанне традыцыйных, электронных і рэсурсаў аддаленага доступу ў розных кірунках метадычнага забеспячэння тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Дзямешка, Л. А.* Бібліятэка і вольны час: вучэб. дапам. / Л. А. Дзямешка; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1995. – 74 с.

2. *Домаренко, Е. В.* Культурно-досуговая деятельность библиотеки: науч.-практ. пособие / Е. В. Домаренко. – М.: Либерея-Бибинформ, 2006. – 77 с.

3. *Жарков, А. Д.* Технология культурно-досуговой деятельности библиотек: учеб.-метод. пособие / А. Д. Жарков. – М.: Либерея-Бибинформ, 2008. – 190 с.

4. *Жаркова, Л. С.* Методика организации работы библиотеки в сфере социально-культурной деятельности: науч.-практ. пособие / Л. С. Жаркова. – М.: Литера, 2009. – 110 с. – («Современная библиотека»; вып. 44).

5. *Ловкова, Т. Б.* Библиотека как центр досуга: учеб.-метод. пособие / Т. Б. Ловкова. – М.: Либерея-Бибинформ, 2009. – 104 с. – («Библиотекарь и время. XXI век»; вып. 102).

6. *Мойсейчук, С. Б.* Культурно-досуговые программы в системе работы библиотеки с читателями / С. Б. Мойсейчук // XI Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры: матэрыялы чытанняў, Мінск, 24–26 мая 2005 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – С. 95–99.

7. *Мойсейчук, С. Б.* Постановка культурно-досуговых программ в технологиях арт-менеджмента / С. Б. Мойсейчук // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі: матэрыялы навук. канф., прысвечанай 35-годдзю БДУКМ, Мінск, 3 снежня 2010 г.: [у 2 т.] / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старшыня) [і інш]. – Мінск, 2011. – [Т. 2.]. – С. 25–29.

8. *Мойсейчук, С. Б.* Режиссура культурно-досуговых программ: учеб.-метод. пособие / С. Б. Мойсейчук; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2011. – 98 с.

9. *Мотульский, Р. С.* Национальная библиотека Беларуси: учеб. пособие для вузов / Р. С. Мотульский; Нац. б-ка Беларуси; Бел. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2009. – С. 67–74.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Олзоева, Г. К.* Массовая работа библиотек: учеб.-метод. пособие / Г. К. Олзоева. – М.: Либерея-Бибинформ, 2006. – С. 37–104.

*11. Смаргович, И. Л.* Основные тенденции развития культурно-досуговой сферы в Беларуси на современном этапе / И. Л. Смаргович // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі: матэрыялы навук. канф., прысвечанай 35-годдзю БДУКМ, Мінск, 3 снежня 2010 г.: [у 2 т.] / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старшыня) [і інш.]. – Мінск, 2011. – [Т. 2.] . – С. 52–56.

*12. Сокал, М. У.* Бібліятэка ў структуры вольнага часу насельніцтва: метадычныя парады публічным бібліятэкам / М. У. Сокал; Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1995. – 46 с.

*Дадатковая*

1. *Аниськова, Л. П.* Культурно-досуговая деятельность в социализации личности подростка / Л. П. Аниськова // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2010. – № 12. – С. 49–51.

2. *Бігеза, В. М.* Сацыякультурны накірунак падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па рабоце з дзецьмі / В. М. Бігеза // Бібліятэка прапануе. – 2009. – № 2. – С. 25–29.

3. *Горбачева, Л. В.* Информационные потребности специалистов социокультурной сферы: некоторые подходы и технологии к выявлению и обеспечению / Л. В. Горбачева // Современные информационные технологии в Национальной библиотеке Беларуси: сб. статей / Нац. б-ка Беларуси; сост. А. А. Шереметьева. – 2-е изд. – Минск, 2009. – С. 92–106.

4. *Григорьева, Е. И.* Основные подходы к реализации социально-культурных технологий в научных исследованиях / Е. И. Григорьева // Социально-культурная деятельность: современные технологии: материалы Всерос. науч.-практ. конф. преподавателей вузов культуры и искусств, Челябинск, 27 ноября 2007 г. / сост. В. М. Рябков; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – Челябинск, 2007. – С. 30–45.

5. *Дзямешка, Л. А.* Культурна-асветніцкая і адукацыйная дзейнасць бібліятэк Беларусі ў гістарычным аспекце / Л. А. Дзямешка // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

науки: сб. науч. ст. / под ред. В. Ф. Беркова. – Минск, 2008. – Вып. 6, ч. 2. – С. 85–95.

6. *Зайцев, В. Н.* Социокультурная деятельность библиотек – один из путей развития информационного общества / В. Н. Зайцев // Библиотековедение. – 2006. – № 2. – С. 23–26.

7. *Зимоненко, А. Р.* Библиотека как культурный и досуговый центр / А. Р. Зимоненко. – М., 1990. – 53 с.

8. *Карзанава, А.* Сучасныя формы публічнай работы / А. Карзанава // Бібліятэка прапануе. – 2007. – № 3. – С. 27–30.

9. *Карзникова, Л. Г.* Библиотека. Клубная работа: чья это функция? / Л. Г. Карзникова // Библиотека. – 2003. – № 2. – С. 18.

10. *Киселева, Т. М.* Если ты убиваешь время, время убивает тебя, или Как библиотека способствует развитию личности / Т. М. Киселева // Библиотечное дело. – 2008. – № 7 (73). – С. 28–30.

11. *Козловская, Л. И.* Игра в социокультурном пространстве / Л. И. Козловская // Сацыякультурная дзейнасць: метадалогія, змест, методыка: матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск, 4–5 лют. 2003 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2004. – С. 117–119.

12. *Козловская, Л. И.* Культурно-досуговые программы в структуре социокультурной деятельности / Л. И. Козловская // Социальная пелагогика. Проблемы инкультурации личности. – Минск: Четыре четверти, 2007. – С. 43–51.

13. *Маркова, В. Н.* Изучение социокультурного пространства библиотеки / В. Н. Маркова // Научные и технические библиотеки. – 2006. – № 5. – С. 43–47.

14. *Мотульский, Р. С.* Как вас теперь называть? Информатека, медиатека, гибридная или просто библиотека? / Р. С. Мотульский // Библиотека. – 2002. – № 3. – С. 48–52.

15. *Муравьёва, Л.* Во власти странных дум…: литературный, литературно-философский, литературно-публицистический разговор как жанр библиотечной режиссуры / Л. Муравьёва, Т. Рудишина // Библиотека в школе. – 2001. – № 5. – С. 12–15.

16. *Национальная* библиотека Беларуси: новое здание – новая концепция развития / Нац. б-ка Беларуси; науч. рук. Р. С. Мотульский. – Минск, 2007. – С. 197–210.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Новаторов, В. Е.* Культурно-досуговая деятельности: словарь-справочник / В. Е. Новаторов. – Омск: Изд-во Алт. гос. ин-та культуры, 1992. – 183 с.

*18. Пераверзева, Ю. А.* Роля матэрыяльна-тэхнічнай базы ў фарміраванні бібліятэчнага асяроддзя / Ю. А. Пераверзева // Культура: открытый формат – 2011 (библиотековедение, библиографоведение, книговедение, искусствоведение, культурология, социокультурная деятельность): сб. науч. работ / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств; науч. ред. М. А. Можейко. – Минск, 2011. – С. 284–286.

*19. Пераверзева, Ю. А.* Роля сацыяльна-культурнага асяроддзя ў праектнай дзейнасці бібліятэк / Ю.А. Пераверзева // Научные труды Республиканского института высшей школы. Философско-гуманитарные науки: сб. науч. ст. / под ред. В. Ф. Беркова. – Минск, 2007. – Вып. 3. – С. 38–43.

*20. Родевич, Т. Н.* Социокультурное проектирование и моделирование культурно-досуговой деятельности / Т. Н. Родевич // Весн. Бел. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 79–83.

*21. Рябушева, Ю.* Библиотека – КИЦ / Ю. Рябушева // Научные и технические библиотеки. – 2003. – № 4. – С. 43–51.

*22. Смаргович, И. Л.* Социально-культурная сущность досуга в постиндустриальную эпоху / И. Л. Смаргович // Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13–14 ліст. 2008 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: Н. А. Ляйко (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 71–79.

*23. Смаргович, И. Л.* Культурно-досуговая индустрия как новая технология в социально-культурной сфере / И. Л. Смаргович // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 19–20 апр. 2007 г. / Бел. гос. акад. искусств; науч. ред. С. П. Винокурова. – Минск, 2008. – С. 290–294.

*24. Шереметьев, С. И.* Социокультурная деятельность Национальной библиотеки Беларуси: состояние и перспективы развития / С. И. Шереметьев // Организация обслуживания пользователей: из опыта работы Национальной библиотеки Беларуси: сб. ст. / Нац. б-ка Беларуси; сост. Е. Е. Долгополова; редкол. Л. Г. Кирюхина [и др.]. – Минск, 2009. – С. 20–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ТЭХНАЛОГІІ КУЛЬТУРНА-ДАСУГАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (па напрамах), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01*
*Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент),*
*спецыялізацыі 1-23 01 11-01 03 Культурна-дасугавая дзейнасць бібліятэк*

Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012 г. Фармат 60x84 $^{1}/_{16.}$
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,28. Ул.-выд. арк. 0,83.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ